МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
26 ліпеня 2017 г.
№27 (411)



стар. 3

**Як завабіць наведвальнікаў у бібліятэку?**



стар. 6

**Чэмпіёнамі становяцца... насуперак**



стар. 8

**"Гарадскі" ўспамін Улы**

ТЭМА ТЫДНЯ

# ФІЗКУЛЬТ–УРА!

## ЦІ ЎСЮДЫ Ў РЭГІЁНАХ КРАІНЫ ЁСЦЬ МАГЧЫМАСЦЬ ЗАЙМАЦЦА СПОРТАМ?



Фота БЕЛТА.

**АПОШНІЯ статыстычныя даныя кажуць пра тое, што ўсё больш беларусаў выбіраюць здаровы лад жыцця і пачынаюць займацца фізкультурай. Міністэрства спорту і турызму краіны вядзе статыстыку, згодна з якой кожны чацвёрты жыхар, а гэта 2 млн 157 тыс. 349 беларусаў, або 22,5% насельніцтва, займаецца фізкультурай. Лічба ўражвае. Калі параўноўваць па гэтым паказчыку Беларусь з краінамі-суседкамі, то яна крыху саступае Расіі (23—30% насельніцтва, розныя крыніцы называюць розныя лічбы) і значна наперадзе Украіны (13% насельніцтва). Прытым у спартыўным ведамстве адзначаюць, што літаральна за 8—10 гадоў лічба фізічна актыўных грамадзян у нашай краіне павялічылася на 4%. Але ці заўжды гэта актыўнасць знаходзіць належныя ўмовы для прымянення?**

стар. 4

ПА СУТНАСЦІ СПРАВЫ

# ІМІДЖ КРАІНЫ І... БІЗНЕС

**Мінімальнае ўмяшанне дзяржавы ў эканамічную дзейнасць суб'екта гаспадарання і павышэнне асабістай адказнасці кіраўніка. Пра гэта і іншае беларускія сенатары размаўлялі падчас круглага стала, што прайшоў у Гомелі. У краіне завяршаецца абмеркаванне пакета прававых актаў, накіраваных на развіццё прадпрымальніцтва. Савет Рэспублікі прыняў у ім самы актыўны ўдзел. Важныя дакументы былі прааналізаваны з удзелам членаў Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, а таксама прадпрымальнікаў рэгіёна і прадстаўнікоў выканаўчай улады.**

Гомельшчына — тэрыторыя патэнцыялу, генерацыі і распаўсюджвання інавацый, адзначае **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір ПАНЦЮХОЎ,** і менавіта таму сенатары выбралі горад над Сожам для сваёй паездкі:

— Штогод апошнія пяць гадоў вобласць, яе асобныя раёны і гарады перамагаюць у рэспубліканскіх конкурсах, якія вызначаюць рэгіёны, што спрыяюць вядзенню бізнесу. Мэта дзяржавы, як і бізнесу адна — павышэнне дабрабыту і якасці жыцця насельніцтва.

Доля малога і сярэдняга бізнесу ў бюджэце Гомельшчыны сёння складае 17%, гаворыць **старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Алег БАРЫСЕНКА.** Між тым планы на 2020 год — 30%. **Член Савета Рэспублікі, старшыня Ваўкавыскага райвыканкама Міхаіл СІЦЬКО** адзначае, што самым галоўным вынікам перамен, якіх чакаюць ад прыватнага бізнесу, будзе папаўненне мясцовых бюджэтаў:



— Гэта вядзе да пашырэння сацыяльных магчымасцяў. У нашым раёне за паўгода зарэгістравалася ўжо 110 індывідуальных прадпрымальнікаў, і з іх пяць — малыя прадпрыемствы. Усяго цяпер іх 376. Прыходзяць да нас не толькі беларусы, але і замежнікі. Трэба, каб прадпрымальніцтва мела магчымасць атрымаць аддачы. Каб грошы, якія будуць укладацца ў развіццё, стымулявалі павышэнне заробкаў.

стар. 2